

*«Парк Жылібера» ў Гродне. Фота Сяргея Плыткевіча*

# Гістарычныя сады і паркі Беларусі

***Садова-паркавая архітэктура – гэта спалучэнне прыродных кампанентаў (рэльефу мясцовасці, рэчак, ручаёў, азёраў, лугоў і лясоў) са штучнымі пасадкамі, сажалкамі, каналамі, алеямі, прысадамі, тэрасамі, садова-паркавымі скульптурамі, рознымі збудаваннямі. Радзімай садова-паркавага мастацтва з'яўляецца Італія, дзе ў XVI стагоддзі архітэктары ў ваколіцах Рыма, Фларэнцыі, Падуі і іншых гарадоў стварылі ўнікальныя сады-вілы. У эпоху Рэнесансу і ранняга барока гэтая з'ява распаўсюдзілася на краіны Заходняй Еўропы і неўзабаве трапіла ў Беларусь. Каб стварыць такія паркі і архітэктурныя ансамблі, былі патрэбныя не толькі архітэктары, але і мастакі, скульптары, батанікі, садоўнікі і іншыя спецыялісты, якіх нашы магнаты і шляхта запрашалі з-за мяжы.***

## Альба

Пасля таго, як Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (1549 – 1616) наведаў Італію, ён быў у захапленні ад краявідаў і архітэктуры горада Альба, дзе яшчэ з часоў Рымскай імперыі знаходзіліся загарадныя дамы-вілы рымскіх патрыцыяў. Яны былі размешчаны вакол возера сярод маляўнічай прыроды. Такі парк, як месца летняга адпачынку, Сіротка вырашыў стварыць у ваколіцах Нясвіжа, на беразе рэчкі Уша. Магчыма, работы пачаліся яшчэ ў канцы XVI ст., ужо ў 1604 г. тут былі ўзведзены палацы «Эрмітаж» і «Кансаляцыя». Выява Альбы ўжо ёсць на гравюры Тамаша Макоўскага 1604 г. Утварыўся паркавы комплекс плошчай да 400 гектараў.

Вялікі ўплыў на развіццё падобных комплексаў на Беларусі зрабілі і французскія архітэктары. Да стварэння садова-паркавага мастацтва Францыі меў дачыненне архітэктар Андрэ Ленотр (1613 – 1700). Менавіта ён заклаў славуты Версальскі парк як загарадную рэзідэнцыю французскіх каралёў. Так узнік французскі рэгулярны парк, створаны на грунце італьянскага. Такі парк займае вялікую тэрыторыю, знаходзіцца на плоскім рэльефе альбо тэрасе, што паступова спускаецца да вады (ракі ці канала). Парк канчаткова сфарміраваўся ў XVIII ст. Аснова яго кампазіцыі – гэта галоўная алея даўжынёю больш за два кіламетры. З алеяй перасякаецца вялікі канал шырынёй 20 метраў і даўжынёй каля кіламетра. Адзін з самых прыгожых участкаў парку «Звярынец» быў падобны да Версальскага парку ў выглядзе кола, у якім восем прамянёў-каналаў вялі да круглай сажалкі з востравам, у сярэдзіне якога стаяў паляўнічы павільён. Вада ў каналы трапляла з ракі Уша. Над каналамі былі масткі з белага каменю, а на іх берагах стаялі 4 млыны. Тут быў і сапраўдны звярынец плошчаю 90 гектараў, дзе ўтрымліваліся як мясцовыя, так і экзатычныя жывёлы. Самая старая частка – «італьянскі парк» – злучалася з Нясвіжам галоўнай ліпавай алеяй. Тут быў двухпавярховы палац і «зялёны тэатр», дзе праходзілі спектаклі пад адкрытым небам. У Альбе дзейнічалі розныя мануфактуры і былі нават ваенныя вучэльні – артылерыйская і мараходная. Аднак пасля знікнення Рэчы Паспалітай ужо ў пачатку XIX ст. парк быў занядбаны.

У канцы мінулага стагоддзя тут хацелі стварыць пейзажны парк, рабілі першыя крокі, але потым працы спыніліся. У пачатку XXI ст. Альбу вырашылі аднавіць як месца адпачынку. Былі праведзены археалагічныя раскопкі, расчышчана рэчышча Ушы, некалькі гадоў працаваў моладзевы валанцёрскі летнік. Калі будзе адноўлена былая інфраструктура, Міншчына атрымае новую зону адпачынку.

***(Заканчэнне на стар. 3)***

# Гістарычныя сады і паркі Беларусі

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

## Мір

Не забыў Сіротка і пра сваю новую маёмасць – Мірскі замак, які стаў належаць Радзівілам пасля 1569 г. Вакол гатычнага замка былі насыпаны валы з бастыёнамі па кутах, абведзеныя вакол равамі з вадой. На поўнач ад вала заклалі «італьянскі сад», а з усходу – фальварак з гаспадарчымі будынкамі.

За 3 кіламетры ад замка зрабілі звярынец, дзе былі прасекі-промні дзеля кругавога абстрэлу, а навокал – загоны, дзе трымалі дзікіх звяроў. Мірскі парк моцна пацярпеў у часы вайны 1654 – 1667 гг. У 1688 г. у інвентары Мірскага замка паведамлялася: *«італьянскі сад ад маскоўшчыны спустошаны, у якім больш за ўсіх дрэў – ляшчына»*.

Зноў «італьянскі парк» быў адноўлены пасля 1738 г. Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што тут было каля 400 рэдкіх дрэў, якія вырошчваліся ў бочках у аранжарэі, збудаванай з бярвенняў. Улетку іх выстаўлялі на адкрытае паветра. Тут раслі цытрусы, фігі, мірт, кіпарыс, самшыт, чырвонае і лаўровае дрэвы, італьянскі арэх. Аднак у канцы XVIII ст. сад зноў заняпаў. Адраджэнне парку пачалося ў 1933 г., калі яго апошні гаспадар князь Міхаіл Святаполк-Мірскі перасяліўся ў Мірскі замак. Вакол замка і на яго двары пачалі вырошчваць ружы. Былі запрошаны іншаземныя садоўнікі, дзякуючы якім парк атрымаў рамантычны каларыт. Былі пасаджаны экзатычныя дрэвы: піхта Фразера, елка Энгельмана, сасна Веймутава, дугласія шэрая і інш. Паміж паркам і замкам квітнелі вялікія кусты язміну.



*Парк Альба. Фота Сяргея Плыткевіча*

У кастрычніку 1978 г. улады БССР прынялі рашэнне аб рэстаўрацыі Мірскага замка і яго наваколля. Першая чарга рэстаўрацыі замкавага комплексу была завершана ў 2011 г. Аднаўленне «італьянскага саду» ва ваколіцах замка працягваецца.

## Гродна

Пасля эпохі барока ў Еўропе распаўсюджваецца класіцызм, які супадае па часе з рамантызмам, што запанаваў у літаратуры і мастацтве з канца XVIII ст. Ён знайшоў сваё адлюстраванне ва ўсіх відах архітэктуры і мастацтва.

У 1770-я гг. гродзенскі староста Антоній Тызенгаўз запрасіў у Гродна з Францыі медыка і батаніка Жана Эмануіла Жылібера, які заснаваў у горадзе ўнікальны батанічны сад, самы вялікі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У першай палове XIX ст. ён стаў называцца гарадскім садам. У другой палове XIX ст. тут з'явілася «Швейцарская даліна».

Пасля Другой сусветнай вайны былы батанічны сад стаў гарадскім паркам культуры і адпачынку. У 1960-я гг. тут пасадзілі шмат новых дрэў, і асабліва кустоў. У парку захаваліся два будынкі, узведзеныя яшчэ ў часы Тызенгаўза – тэатра і медыцынскай акадэміі. У парку з'явіліся гіпсавыя скульптуры і фантан. Цяпер ён называецца Парк Жылібера.



*Парк каля Мірскага замка. Фота Віктара Дняпроўскага*

## Залессе

Вельмі цікавы сімбіёз рамантызму і класіцызму склаўся ў адзін садова-паркавы ансамбль у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна. У другой палове XVIII ст. тут існаваў маёнтак Агінскіх, уплывовых беларускіх магнатаў. Спачатку быў пабудаваны драўляны палац і пасаджаны рэгулярны парк. У 1802 г. тут пасяліўся вядомы грамадскі і палітычны дзеяч Міхал Клеафас Агінскі. Ён вырашыў цалкам перабудаваць свой маёнтак і запрасіў зрабіць гэта прафесара архітэктуры Віленскага ўніверсітэта Міхала Шульца. Да 1815 г. быў збудаваны цагляны палац у стылі класіцызму вельмі адметнай архітэктуры. Тут чаргуюцца адна- і двухпавярховыя аб'ёмы. Побач узніклі аранжарэі і дом садоўніка. Летам ва ўнутраны дворык каля палаца з аранжарэі выносілі вазоны з кветкамі і цеплалюбівымі раслінамі.

Новы залескі парк меў цалкам рамантычны характар – разнастайныя павільёны, альтанкі, масткі і памятныя камяні. Адзін з іх у гонар Касцюшкі. Побач з англійскім паркам былі два звярынцы. У адным былі дзікія жывёлы, а другі выкарыстоўваўся для прагулак.

Каля старой сажалкі з'явіўся вадзяны млын. Шмат было клумбаў з рознымі кветкамі. Парк меў цяністыя барозавыя і таполіныя алеі, дзе было вельмі ўтульна ў летнія спякотныя часы. Сябры Агінскага, якія тут не раз бывалі, назвалі сядзібу «Паўночныя Афіны». Аднак у канцы XIX ст. яна заняпала. Моцна пацярпела і ў часы Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў. Аднак новая гаспадыня сядзібы Марыя Жабракоўская ў перыяд з 1927 па 1939 г. аднавіла палац і ўпарадкавала парк. У 1953 г. палацава-паркавы ансамбль узялі пад дзяржаўную ахову і зрабілі тут дом адпачынку. З 1996 г. тут быў філіял Дзяржаўнага музея беларускай літаратуры. Потым – «Музей Агінскага» (філіял Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры). Рэстаўрацыя ансамбля ішла доўга, першыя спробы рэстаўрацыі адбываліся ў 1990-я гг. А завяршылася ў 2012 г. Тады аднавілі каплічку, узвялі млын і паставілі альтанку Амеліі. Потым палац доўга быў на кансервацыі.

***Пісьмовыя крыніцы канца XVIII – пачатку XX ст. дазваляюць сцвярджаць, што абавязковай часткай шляхецкай рэзідэнцыі быў парк, разбіты па італьянскім (у пачатку стагодддзя), французскім або англійскім (у канцы стагоддзя) узорах. Паркі аздабляліся альтанкамі і статуямі ў антычным стылі, штучнымі гротамі, каналамі, вадаспадамі. У засені старых дрэў будавалася каплічка. Значную частку шляхецкай рэзідэнцыі займаў сад, дзе за ліпавымі прысадамі раслі яблыні, грушы, вішні і слівы. І такіх паркаў і садоў у Беларусі было шмат. На жаль, захаваліся толькі некаторыя з іх, ды і тое яны ў лепшым выпадку цяпер знаходзяцца ў стадыі аднаўлення.***

*Алег ТРУСАЎ*

***(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)***





*Сядзіба і парк у Залессі. Фота Максіма Гальпяровіча*